Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

ЗА ПРАЦУ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаваная залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 4 Вільня, Серада 14-га лістапада 1928 г. Год 1

Дзесятыя угодкі Польшчы і беларускае грамадзянства.

У суботу 10-га лістапада і ў нядзелю 11-га—польскае грамадзянства сьвяткавала дзесятыя ўгодкі незалежнасьці польскае дзяржавы. Як водзіцца ў такіх выпадках у буржуазным грамадзянстве—адбываліся набажэнствы, урачыстыя паходы, акадэміі, паседжаньні; выказваліся ўрачыстыя прамовы, газэты ў павялічаным разьмеры апавяшчалі аб гэтым урачыстым акце ў тоне энтузіязму і патосу... У суботу 10-га лістапада адбылося ўрачыстае паседжаньне Сойму і Сэнату, дзе „сацыяліст“ Дашынскі (якога цяпер буржуазныя газэты назвалі найвялікшым у Польшчы прамоўцам) і Шыманскі сказалі надзвычайныя прамовы, падкрэсьліваючы значэньне сьвята і заслугі будаўнічых Польшчы, як Пілсудскі і інш. Усё зьлілося ў агульным упаеньні і агульным задаваленьні сваім палажэньнем. І пэпэсы яшчэ больш другіх галасілі сваім грамадзянам аб гэтым урачыстым дню.

Адно толькі зацямняла агульную радасьць. У ўрачыстасьцях ня прымалі ўчасьця нацыянальныя меншасьці—беларусы, украінцы і немцы, ня гледзячы на тое, што „сацыяліст“ Дашынскі выразна падкрэсьліў у сваей прамове, што „Zupełnie równouprawnienie obywatelskie otrzymały również mniejszości narodowe“ („Kur. Wil.“). Угадовыя соймавыя клюбы беларусаў, украінцаў і немцаў падалі матываваныя заявы аб сваей адсутнасьці, а радыкальныя клюбы — Беларускі Сялянска-Работніцкі і Украінскі Сель-Роб—лявіца — проста не зьявіліся на ўрачыстае паседжаньне, не знаходзячы патрэбным на ім быць прысутнымі.

Гэтая адсутнасьць, па-за тлумачэньнем, што гэта сталася па камандзе Бэрліна, усё-ж не магла не адбіцца ў прэсе, якая ўбачыла, што гэты факт для буржуазіі польскай, уключаючы, напэўна, і пэпэсаў, „pocieszającym nie jest“.

З прычыны частых канфіскатаў газэты мы не адважваемся тлумачыць гэтага зьявішча з пункту гледжаньня інтарэсаў беларускіх сялян і работнікаў. Мы пэўны ў тым, што сяляне і работнікі самі дакладна здаюць сабе справу з таго, што адбылося і якое значэньне гэта мае для іх. Толькі тут яны ўбачаць больш выпукла, як партыя пэпэсаў зьлілася ў агульным моры галасоў і навет выдзяліла свой вышэй усіх.

Для нас становішча Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу ў даным выпадку зьяўляецца кіруючым.

Мы хочам толькі зьвярнуць увагу, што факт дзесятых угодкаў існаваньня Польшчы прайшоў без выяўленьня хоцьбы якой праявы ўчуцьця — ня толькі з боку абадвух беларускіх пасольскіх клюбаў, ня толькі сялянска-работніцкіх масаў, а навет усяго беларускага грамадзянства.

Мы ня маем вестак аб захаваньні ў гэтыя дні г. зв. „полёнофільскіх“ групкаў, але ніхто іх голасу таксама ня чуў. Як здаецца — тут нейкая аналёгія з г. зв. „Маўчалівым Соймам“ даўнейшай Польшчы.

Тыя-ж буржуазныя польскія газэты гатовы бачыць у гэтым факце „нэгацыю дзяржавы“ („Kur. Wil.“), але маўчаць аб сутнасьці дзяржавы.

Мы з выказаных вышэй прычынаў таксама ня выказваемся аб гэтай сутнасьці і аб адношаньні яе да працоўных масаў, прыватна да беларускіх. Беларускія працоўныя масы даволі сьпелыя, даволі сьвядомыя, каб добра і без тлумачэньняў разумець гэтую сутнасьць. Як і ў першае дзесяцёх-годзе, так і ў наступнае беларускія сяляне і работнікі, не адкідаючы факту існаваньня дзяржавы, будуць змагацца разам з польскімі і іншымі працоўнымі гушчамі за свае агульныя правы і інтарэсы, а разам і за самавызначэньне народаў, спадзяючыся толькі на свае ўласныя сілы.

Адбытае сьвята, ясна, яны лічаць—не сваім сьвятам!

Камуністычны „шах і мат“—нямецкай сацыял-дэмакратыі.

Як ведама, урад Мюллера (сацыял-дэмакрата) аднагалосна зацьвердзіў пастанову папярэдняга нямецкага ўраду—аб будаваньні браняносца, што выклікала вялікае хваляваньне ў лоне сацыял-дэмакратычнай партыі, якую за гэта сярод работніцкіх масаў асабліва атакавалі за гэты мілітарызм—камуністы. Камуністы, якія рашуча і адразу выказаліся проці будовы браняносца, патрэбавалі, каб у гэтай справе ўрад запытаўся беспасрэдна волі народу шляхом так зван. „плебісцыту“, ці — ўсенароднага галасаваньня. „Сацыялістычны“ ўрад Мюллера тлумачыў сваю пастанову тым, што яму фактычна ня было магчымасьці іншага рашэньня—бо папярэдні ўрад, праўда без законнай падставы, але фактычна—настолькі ўжо пасунуў справу будаваньня браняносца, уверана ў наступным фармальным зацьверджаньні з боку парляманту, што цяпер спыніць будову каштавала-б значна больш для дзяржаўнага скарбу, чым давясьці працу да канца...

Як бы ні было, але скандал у лоне нямецкіх сацыялістычных „пацыфістаў“ вышаў вялізарны, даўшы, як сказана, шмат матэрыялу для акцыі проці іх з боку камуністаў—сярод работніцкіх масаў Нямеччыны. Маючы перадусім, трэба думаць, на мэце агітацыйную акцыю сярод апошніх, камуністы і патрэбавалі — на падставе Вэймарскай Канстытуцыі—тасаваньня плебісцыту. Але Канстытуцыя кажа, што ўсенароднае галасаваньне можа адбыцца толькі тады, калі яго патрэбуе 10 працэнтаў (дзесятая частка) ўсіх выбаршчыкаў. Толькі з такой лічбай выбаршчыкаў Канстытуцыя прызнае канешным лічыцца, як з выражэньнем „жаданьня народу“ („Volksbegehr“). Трэба думаць, што нямецкія камуністычныя павадыры лепш, як хто іншы, ведалі, што не зьбяруць патрэбнага ліку галасоў на прадуступным галасаваньні, ведалі, насколькі папулярна ў Нямеччыне жаданьне ўваскрашэньня ваеннага флёту, асабліва пры тэй небясьпецы, якой зьяўляюцца для Нямеччыны яе парэзаная на кавалкі тэрыторыя (адрэзаная Усходняя Прусія) і гатовыя базы для англійскага і французскага флёту ў тылу Нямеччыны—ў портах розных балтыцкіх дзяржаваў, у тым ліку—Польшчы.

Такім чынам, трэба думаць, што камуністы проста жадалі скарыстаць з добрага прыпадку, каб—з аднаго боку, правесьці чарговую „пацыфістычную“ кампанію, а заадно—і агітацыю проці сучаснага ўраду, асабліва-ж—проці сваіх „найвялікшых ворагаў“—бо—канкурэнтаў на ўплывы сярод работніцкіх масаў—сацыял-дэмакратаў. Як ведама, апошні кангрэс Камінтэрну выразна прызнаў гэтую барацьбу з сацыялізмам, — „раскрыцьце буржуазнай прыроды сацыялізму, як найспрытнейшага абаронцы капіталізму“, „ўдарнай задачай“ камуністычнай акцыі на бліжэйшы перыяд часу. Дзеля ўсяго гэтага нямецкія камуністы пастанавілі якмага выкарыстаць заправуды ж надаючыся да гэтага скандальны факт — згоднага галасаваньня сацыялістычных міністраў поруч з буржуазнымі за марскія збраеньні — пасьля ўсіх пацыфістычных праграмавых заяваў сацыял-дэмакратыі на яе зьездах і чарговых мітынгах. А бьючы ў сацыялістычных міністраў, камуністы траплялі адначасна ў падвойную мэту: білі па партыі С.-Д., аслабляючы яе ўплывы сярод работнікаў, і—па ўрадавай коаліцыі, выклікаючы магчымасьць габінэтнага крызісу ў краі...

І вось, камуністычная партыя шырока арганізавала—на точнай падставе канстытуцыі-агітацыю ў часе прадуступнага галасаваньня ў справе плебісцыту. Па ўсяму краю—ў працягу значнага часу—адбываліся мітынгі з баявымі поклічамі: „далоў узбраеньні“! „далоў сацыял-мілітарыстаў“! „далоў урад Мюллера“! Сацыял-дэмакратам горача прышлося ў часе гэтай неспадзеванай „выбарнай кампаніі“. — Прыходзілася ўсьцяж адказваць на забіўчыя закіды з боку камуністаў, выкручывацца неяк з вельмі нявыгаднага для іх палажэньня.

Як можна было прадбачыць, прадуступнае галасаваньне не дало вымаганага канстытуцыяй ліку „дэкляарацыяў“. Цікаўна адзначыць, што галасаваньне не дало навет паловы тых галасоў, якія атрымалі камуністы на апошніх выбарах у Рэйхстаг... Такім чынам спэцыяльная акцыя камуністаў за плебісцыт правалілася цалком. Як тлумачыць нямецкая прэса, правалілася ў значнай меры дзеля таго, што падача гэтых дэкляарацыяў у справе плебісцыту адбываецца—не раўнуючы з парляманцкімі выбарамі — адкрыта і яўна—з поўным падпісам выбаршчыка. Дык, зразумела, аказалася, што большая палова тых, што падавалі свае галасы за камуністаў пры тайных выбарах, пры яўных дэкляарацыях ухілілася ад выказаньня сваіх сацыяльна-палітычных сымпатыяў („Кур. Крак“ № 293)...

Бліжэйшая мэта камуністаў, такім чынам, ня была дасягнута. Але за тое, як сьцьвярджае нямецкая прэса, іншыя—далейшыя, а мо, й важнейшыя мэты ўсей акцыі проці сацыял-дэмакратыі былі дасягнены цалком: „сацыялістычны ўрад“ Мюллера, як пішуць газэты, атрымаў такі ўдар, што можна спадзявацца навет—крызісу габінэту!..

Перадусім акцыя камуністаў у значнай меры ўдалося, як цьвердзяць іх газэты, падарваць у работніцкіх масах даверые да сацыял-дэмакратычных павадыроў, стаўшых — на міністэрскіх лаўках—нягоршымі мілітарыстамі, як іх папярэднікі—нямецкія нацыяналісты. Прыпёртыя да муру сацыял-дэмакраты на мітынгах тлумачылі паступаньні сваіх міністраў тым, што яны, галасуючы за браняносец, гэтым—„прыносілі ахвяру дзеля ўтрыманьня за ўсялякую цану тэй урадавай коаліцыі, якая дае нямецкім работнікам — праз іхніх міністраў—такое вялікае ўчасьце ў-ва ўладзе“!.. Калі-ж бы міністры сацыялісты адмовіліся галасаваць поруч з буржуазнай часткай ураду, тады зараз-жа развалілася-б коаліцыя, і на месца сацыялістаў у склад коаліцыі ўвайшлі-б найвялікшыя ворагі работніцкай клясы—нацыяналісты, якія-б пачалі йграць у новым права-цэнтровым урадзе тую-ж ролю, якую мелі ў папярэднім. А будова браняносца была-б толькі—падмуравана...

Насколькі нямецкія сацыял-дэмакраты, аднак-жа, мала былі пераконаны самі гэтай уласнай іх аргумэнтацыяй, не трапляўшай, трэба думаць, да пераконаньня работніцкіх масаў, разагітаваных камуністамі (трэба дадаць, што ўплывы камуністаў узрасьлі ў апошні час—у сувязі з узростам безрабоцьця ў Нямеччыне) відаць з таго, што сацыял-дэмакратычныя паслы — пасьля вялікай барацьбы ў лоне партыі — раптам унесьлі ў парлямант заяву, трэбуючую спыненьня будовы браняносца!.. Гэтае дамаганьне, яўна прынятае сацыял-дэмакратыяй пад націскам камуністычнай агітацыі—дзеля ўтрыманьня сваіх уплываў сярод работніцкіх масаў, — паказвае ўсю забіўчую сілу палямічнай тактыкі нямецкіх камуністаў, заправуды-ж даўшых сацыял-дэмакратам, калі не сьмяротны „мат“, дык у кожным разе забіўчы „шах“, як кажуць шахматысты...

Перадусім—сваім дамаганьнем спыненьня будовы браняносца сацыял-дэмакратычны клюб Рэйхстагу дабівае ўсю адказную аргумэнтацыю сваіх аратараў на мітынгах проці закідаў камуністаў. А побач з тым — задае сьмяротны ўдар сваім-жа ўласным міністрам у габінэце—на чале з самім прэм'ерам Мюлерам.—На чаргу дня выразна ставяць крызіс габінэту самі арганізатары і павадыры ўраду—сацыял-дэмакраты.

Палажэньне сацыялістычных міністраў у кожным выпадку—вельмі дрэннае.—Бо-ж калі прапазіцыя чаловага ў Рэйхстагу с.-д. клюбу будзе адкінена большасьцю парляманту, і пасьля гэтага с.-д. астануцца ў складзе ўраду, тады камуністы атрымаюць новыя падставы для палямічнай атакі проці с.-д., якая пакідае сваіх прадстаўнікаў у ўрадавай коаліцыі — пасьля таго, як парляманцкая большасьць адкінула так прынцыпова матываванае іх клюбам дамаганьне.

Калі-ж парлямант прыме прапазіцыю с.-д. клюбу, тады—зразумела—разваліцца з такім трудам склееная сацыял-дэмакратам ўрадавай коаліцыі — ужо з пачыну яе буржуазнай часткі, якая амаль не цалком — за будову браняносца...

І вось, цяпер усе клюбы парляманту і ўвесь край ламаюць галаву над — „галаваломкай“, якую задалі ім камуністы: „ці будзе прынята парлямантам, ці—наадварот—праваліцца прапазіцыя с.-д. клюбу аб спыненьні будовы браняносца“. — Бо ад гэтага залежыць, можа, ня толькі лёс габінэту, але і новыя выбары!.. А найцікаўней з усяго, — што лёс гэтай прапазіцыі с.-д. клюбу — пры сучасным укладзе партыйных сілаў у Рэйхстагу—залежыць... ад камуністаў...

Львоўскія падзеі.

1-га лістапада с. г. выпалі дзесятыя ўгодкі Львоўскіх падзеяў (1918 — 1928 г.). Украінскія нацыяналістычныя арганізацыі пастанавілі гэты дзень сьвяткаваць і пасьвяціць памяці забітых тагды ўкраінскіх паўстанцаў.

І вось, як падаюць польскія газэты, у часе гэтага сьвяткаваньня дайшло да крывавых падзеяў на вуліцах Львова.

Распачалося, быццам, з таго, што яшчэ ўночы, з серады на чацьвер, хтось падкапаў фундамант польскага помніка абаронцам Львова каля станцыі Пэрсэнкоўкі і, падлажыўшы дынамітны патрон,—узарваў. Сілай ўзрыву адарвала частку фундаманту і нязначна пашкодзіла помнік. Пачуўшы гук, са станцыі прыбеглі два паліцэйскія і ўбачыўшы, у чым справа, адзін пабег да тэлефону, а другі застаўся на мейсцы. Хутка ён заўважыў у цемнаце дзьве чалавечыя фігуры, якія ўцякалі да лесу, пагнаўся і перагарадзіў ім дарогу. Незнаёмыя далі шэсьць стрэлаў і, цяжка раніўшы паліцэйскага, уцяклі.

У тую-ж самую ноч нявыкрытыя яшчэ асобы пасеклі і аблілі чарнілам другі помнік „Orląt Lwówskich“ каля будынку Палітэхніка.

Зраньня 1-га лістапада Украінцы вывесілі на будынку Унівэрсытэту і на капцы Люблінскай Уніі свае нацыянальныя сьцягі, якія, аднак, былі хутка зьняты паліцыяй.

А гадзіне чацьвертай па палудні, каля 2 тысяч ўкраінцаў сабралася на малебства ў уніяцкую царкву Сьв. Юрыя. Па заканчэньні малебства, на дзядзінцу прамаўлялі ўкраінскія паслы—Ляшчынскі і Цялевіч, якія заклікалі прысутных пайсьці на Лычакоўскі магільнік за места, дзе ляжаць косьці ўкраінскіх паўстанцаў. Згуртаваўся вялізарны паход. На вуліцы Міцкевіча яму перагарадзіла дарогу паліцыя і пачала разганяць натоўп. Украінцы пратэставалі, падняўся шум гвалт, а хутка ўзнялася бойка і навет загрымелі стрэлы. Палілася кроў. Прыехала конная паліцыя і загнала дэманстрантаў назад на царкоўны дзядзінец. Тут ужо загарэлая фармальная бойка. Украінцы, укрыўшыся за царкоўнай агародай, стралялі, быццам, у паліцыю, а паліцыя па іх. Толькі калі прышлі на падмогу рэзэрвы, паліцыі ўдалося ўварвацца на падворка і разагнаць украінцаў. У часе гэтай страляніны ранена тры паліцэйскія, прабіты нажом вывядоўца і прастрэляны: 14-ці гадовая вучаніца М. Раманчук, сэмінарыстка М. Манчык, вучань Б. Казлоўскі, 19-ці леткі Раман Клінкоў і Язэп Старэцкі.

А гадзіне 7-ай польскія акадэмікі, w odpowiedzi na krwawe demonstracje Ukraińców, сабраўшыся, пачалі выбіваць каменьнямі вокны у памешканьні Украінск. Дому Акадэмікаў. Украінцы пачалі адстрэлівацца. Зьявілася паліцыя. Затрашчалі вінтоўкі. Распачаўся фармальны прыступ на Дом Акадэмікаў, які хутка ўдалося паліцыі здабыць, бо-ж Украінскія студэнты, убачыўшы, што зьявілася паліцыя, перасталі бараніцца. 22 ўкраінскіх студэнтаў арыштаваны. Ці былі арыштаваныя сярод польскіх акадэмікаў—газэты не падаюць.

У часе гэтай сутычкі лёгка ранена 18 паліцэйскіх, прастрэлена і ранена некалькі дзесяткаў асоб.

Гадзіну пазьней натоўп дэманстрацыйна прайшоў па горадзе і скіраваўся на Рускую вуліцу, дзе месьцяцца Украінскія культурна-грамадзкія ўстановы і пачаў грамiць іх. Разьбілі памешканьне Укр. Т-ва „Прасьвіта“. Паламалі і выкідалі на вуліцу друкарскую машыну, мэблі, кніжкі і іншыя рэчы Т-ва.

Разграмілі рэдакцыю Украінскай ўгадовай газэты „Діло“ дзе таксама паламаны і

выкіданы на вуліцу ўсе друкарскія прылады і іншыя рэчы. А так-жа пацярпела ўправа і склеп кааператыву „Маслясаюз“.

Толькі а гадзіне 10-ай ўночы паліцыя пачала разганяць пагромшчыкаў, але тыя, зрабіўшы сваю „працу“, разыходзіліся і самі дамоў.

Аб гэтым зараз-жа павядамілі старшыню ўраду Бартля і міністра ўнутраных спраў—Складкоўскага, які выслаў у Львоў свайго дэлегата дзеля правядзеньня сьледзтва ў гэтай справе.

Хто справакаваў, каму была патрэбнай гэтая разьня і пагромы — хутка павінна высьвеціцца.

Вядома-ж, кожная старана будзе вінаваціць і звальваць віну адна на другую, але трэцяя, бесстаронняя, зможа асудзіць на чыёй старане праўда.

Аб гэтай „праўдзе“ мы ўжо дагадваемся, але маўчым па вядомым прычынам.

Другая польска-літоўская канфэрэнцыя у Каралеўцы (Кэнігсбэргу).

3. XI.—28. распачалася ў Каралеўцы другая сэсія польска-літоўскай канфэрэнцыі, якая павінна, разглядзеўшы даклады працаваўшых сваіх камісіяў, прыняць тыя ці іншыя канчальныя пастановы—у справе ўзнаўленьня камунікацыйных і іншых адносінаў паміж абодвума краямі.

Канфэрэнцыя гэта мае асабліва важнае значэньне, бо ў разе яе такога-ж непасьпеху, якім скончылася першая, уся справа польска-літоўскага спору — на падставе пастановы апошняй сэсіі Рады Лігі Нацыяў—пяройдзе ў рукі Лігі—у тэй ці іншай форме. Гэтага, трэба думаць, баіцца Вальдэмарас. Таму трэба спадзявацца наагул большай уступлівасьці з яго боку прынамсь у справах тэхнічных адносінаў. Зразумела, рахаваць на хаця-б частковае вырашэньне ці навет залагоджаньне палітычнага спору паміж Літвой і Польшчай (у справе Віленшчыны)—няма ніякіх падставаў.

Дык—як, у якой лягічнай сувязі здоле зрэалізавацца паразуменьне, цяжка сказаць наперад.

Першае пленарнае паседжаньне канфэрэнцыі—пад старшынствам Вальдэмараса — занята была дакладамі камісіяў „прыгранічнага руху“ і юрыдычнай, якія здолелі апрацаваць найбольш рэальныя прапазіцыі.

Пасьля дакладу старшыні камісіі „прыгранічнага руху“ літ. пасла ў Бэрліне Сідзікаўскаса і кароткай дыскусіі—праект камісіі быў падпісаны Залескім і Вальдэмарасам. Праўда, мін. Залескі сьцьвердзіў, што праект „умовы, апрацаванай камісіяй, толькі зацьверджвае існуючы стан рэчаў, ня ўводзячы нічога новага“, але—„дзеля ўсталеньня фармальнасьці“ згадзіўся падпісаць праект. Такім чынам, Вальдэмарас можа ўжо ў Жэнэве заявіць, што канфэрэнцыя—дала рэальны рэзультат...

Значна менш пасьпеху мелі на канфэрэнцыі праекты, прадстаўленыя другой камісіяй — для справаў эканамічных, камунікацыйных і транзытных. Даклад старшыні камісіі докт. Заўніўса выклажыў тры праекты польскія і адзін літоўскі, якія камісія ня здолела ўзгодніць. Як і раней, становішча літоўскае рэзка розьнілася ад польскага: польскія праекты прадбачылі— беспасрэднюю камунікацыю (асабовую, таварную, паштова-тэлеграфн.) абодвух краёў—найкарацейшым шляхам—праз супольную граніцу. Літоўскі праект рашуча адкідаў гэта ў груньце слушнае і нармальнае дамаганьне, пазываючыся на ненармальныя палітычныя стасункі паміж абодвума краямі, і дзеля таго прапануючы—усялякую камунікацыю Літвы з Віленшчынай праз Нямеччыну або Латвію...

Дыскусія паміж Вальдэмарасам і Залескім не прывяла да паразуменьня. Па прапазіцыі мін. Залескага выбрана падкамісія, якая ізноў спрабуе, „пакінуўшы набаку розьніцы, высьветліць дакладна іх матывы“...

Прэса справядліва падчырківае, што галоўны пункт перагавораў — якраз у тым, як вырашыцца справа беспасрэдняй камунікацыі паміж Літвой і Польшчай, ад якой залежыць усялякага роду іншыя справы—ўзаёмных стасункаў між імі. Усе іншыя пункты перагавораў, як напр. справа гарантаваньня Польшчай незалежнасьці і нятыкальнасьці Літвы, страцілі ў значнай меры сваю вострасьць пасьля падпісаньня абодвума краямі Трактату Кэллога. Як даносяць карэспандэнты з Каралеўца, выключна аб гэтым пункце ідуць усьцяж прыватна гутаркі паміж Залескім і Вальдэмарасам. Быццам, Залескі—гатовы фармальна заявіць у спэцыяльнай дэкляраціі, што „Польшча ні ў якім прыпадку не скарыстае з факту ўстанаўленьня беспасрэдняй камунікацыі — чыгункавай і ўсякай іншай з Літвой, каб пасьля пазывацца на яе ў мэтах ўмацаваньня свайго становішча ў справах, прызнаных літвой спорнымі (справа Віленшчыны“), (карэсп. „Кур. Варш.“).

Такім рашучым крокам з боку Залескага Вальдэмарас „быў бы прыперты да муру і змушаны—цалкам адкрыць свае карты: паказаць, ці ён запраўды хоча паразуменьня з Польшчай і ці „даручэньні Рады Лігі Нацыяў маюць для яго якое-небудзь значэньне“...

У панядзелак 5/XI мела адбыцца паседжаньне гэтай найважнейшай падкамісіі, ад якой залежыць увесь пасьпех канфэрэнцыі.

Апошняя тэлеграма кажа, што ў панядзелак падкамісія ня здолела прыйсьці да згоды, і праца яе адкладзена на аўторак.

Ці ёсьць надзеі на паразуменьне, выразных даных аб гэтым весткі з Каралеўца не даюць.

7/XI. як падае ПАТ, зачынена польска-літоўская канфэрэнцыя ў Каралеўцы, якая не прывяла да паразуменьня. Літоўская дэлегацыя запрапанавала стварэньне для Віленшчыны спэцыяльнага статуту з міжнароднымі гарантыямі. Гэная прапазіцыя адкінута польскай дэлегацыяй.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Цікавая нарада.

Мін. Загр. Спраў Залескі адбыў надовячы нараду ў Варшаве з прадстаўнікам Радавых Рэспублік — Багамолавым, Паўночнай Амэрыкі — Стэтсонам і швэдзкім— Анкоршвэрдтам.

Афіцыяльны разлом у П.П С,

Надовячы паслы з П. П. С.: Явароўскі, Даўнароўскі, Шчыпёркі, Гардэцкі і Нізкі заявілі соймавай канцэлярыі, што яны выходзяць з ППС і прасілі, каб ім не адцягалі сяброўскіх складак з пасольскіх дыетаў на клюб ППС.

Мусім адзначыць, што гэты „разлом“ толькі папяровы, бо як старая ППС, так і гэтая новая яе „рэвалюцыйная фракцыя“ служаць аднаму богу — капіталізму; разлом у ёй ёсьць толькі ў тактыцы служэньня, ці іначай у форме рытуалаў.

Урад і ўкраінскія „здарэньні“.

У дзень 1-га лістапада — польскага сьвята „obrony Lwowa“ ў Львове паміж украінцамі і палякамі „здарыліся“ крывавыя бойкі і розныя ўзаемна варожыя маніфэстацыі і выпадкі. На вуліцах йшлі амаль не фармальныя масавыя баі, у якіх брала ўдзел пешая і конная паліцыя. Есьць дужа ахвяраў і, хаця яны яшчэ не аблічаны, аднак, прэса падае, што ёсьць больш 30 раненых паліцыянтаў.

Гэтая хваля ўзаемнага разбурваньня і зьняважваньня (абліваньне „чорнай мазьзю“) памятнікаў перанялася з Львова і на ўкраінскую правінцыю.

Прэса падае, што ўкраінскія выпадкі ўжо зьліквідаваны і што ўрад адбываў у справе іх спэцыяльныя нарады і паміж сабой і з пасламі з адзінкі.

Паслы „бэбэхаўцы“, Лёвэнгэрц і Строньскі зьвярнуліся да Мін. Унутр. Спраў гэн. Складкоўскага з жаданьнем „энэргічнага выступленьня, правядзеньня сьціслага сьледзтва і безварункавага (bezwzględnego) укараньня вінных“, г. з. жаданьнем як найсуроўшых рэпрэсіяў. А віннымі яны лічаць „вывротовых правадыроў“, здэнэрваваньне якіх была відна яшчэ некалькі месяцаў таму назад, і якія быццам знаходзяцца пад кіраўніцтвам Радавых Рэспублікаў і Нямеччыны (?).

На гэтыя „дэмакратычныя“ рады, мін. унутраных спраў гэн. Складкоўскі адказаў, што і ўрад глядзіць так-жа і што ўжо выданы адпаведныя распараджэньні.

Апрача „адпаведных распараджэньняў“ польскі ўрад — панове міністры — прэм'ер Бартэль, мін. Справядлівасьці, Унутраных Спраў і Асьветы — загадалі падлягаючым уладам на абшарах „малапольскіх“ (украінскіх) ваяводзтваў даць як найдакладнейшыя справазданьні з прабегу выпадкаў і аб выніках сьледзтва.

Як будуць пададзены вынікі сьледзтва аб „прабегу“ ўкраінскіх падзеяў — для працоўных масаў і тым больш, для нац. меншасьцяў, ведама хіба і без урадовага „справазданьня“.

„Ахвяра ўкраінскіх замахоўцаў„.

Львоўская прэса падае, што ў Львове ўмёр ад ран паліцыянт Душэнко — „ахвяра ўкраінскіх замахоўцаў, ўзарваўшых дынамітам памятнік Абаронцаў Львова на Пэрсэнкоўцы“.

Перамога работніцкай забастоўкі ў Гдыні.

31.X г. г. адбылася ў Варшаве ў м-ве Працы і Грамадзкае Апекі супольная канфэрэнцыя прадстаўнікоў прафсаюзу транспартоўцаў і прадпрыемцаў у справе зьліквідаваньня зацягнуўшайся забастоўкі транспартовых работнікаў у Гдыні. Канфэрэнцыя адбывалася пры пасярэдніцтве ўрадавага прадстаўніка.

Прадпрыемцы забавязаліся зьліквідаваць забастоўку пры помачы раз'емчай камісіі, выбранай як работнікамі, так і прамысловцамі. Апрача гэтага, прадпрыемцы забавязаліся прызнаць работнікам падбаўку платы і падпісаць умову не пазьней, як 20 лістапада.

Забастоўка ў цывільным лётніцтве.

Выбухла забастоўка адміністрацыйных працаўнікоў цывільнага лётніцтва „Аэралёту“.

Бастуючыя дамагаюцца падбаўкі платы; належаць да прафсаюзу Працаўнікоў Лётніцтва.

Рэха львоўскіх падзеяў.

Ня гледзячы на тое, што ад пачатку львоўскіх падзеяў ужо прашло больш тыдня, усё-ж яшчэ паміж пабіўшымся польскім і ўкраінскім грамадзянствам ня асягнута такой згоды, як да самых „выпадкаў“. Яшчэ 5 г. м. польскія студэнты, дэманстраваўшыя „тыдзень гаспадарчай самавыстарчальнасьці“, зрывалі з украінскіх студэнтаў шапкі, з украінскімі адзнакамі і не дапускалі ўкраінцаў на ўнівэрсытэцкія лекцыі. Украінскія студэнты адносіліся да гэтага спакойна — бяз ніякіх авантураў.

Аднак, ня гледзячы на такое спакойнае захаваньне ўкраінскага грамадзянства, паліцыя ўсё яшчэ знаходзіцца ў вострай пагатоўцы і навет узмацоўваецца пешай паліцыяй з правінцыі.

Арышты і вобыскі сярод украінцаў трываюць. У Львове арыштавана каля ста ўкраінскіх студэнтаў і вучняў. У Тарнаполі арыштавана рад украінскіх „малакасосаў“ (як піша польская прэса), быццам за нелегальныя і антыдзяржаўныя друкі. Зрэвідавана і памешканьне Украінскага Т-ва Апекі над Інвалідамі, „Луг“ і „Сокіл“.

Сьледзтва падзелена на 2 часткі: на сьледзтва проці ўчасьнікаў разрухаў і на сьледзтва проці прыпушчальных іх арганізатараў.

На падставе ўжо сабраных „даных“ паліцыя прыпушчае, што ўсяму вінаваты ўкраінскія студэнты — быццам яны „згуры ўпляновалі“ львоўскія падзеі і толькі дзякуючы ўмеламу апанаваньню сітуацыі паліцыяй, украінцы не дапялі да замераных мэтаў.

Гэтулькі „фактаў“ і гэтак падае польская прэса аб львоўскіх падзеях, водгукі якіх шырока разышліся па ўсім вялікім сьвеце і, разумеецца, перадусім па ўсей Польшчы, ня выключаючы і Сойму.

Украінскія паслы падалі Сойму некалькі экстраных унёскаў (прапазіцыяў), у якіх, даўшы падрабязнае апісаньне падзеяў (цікава было іх пачытаць!), дамагаюцца, каб Сойм выслаў на мейсца спэцыяльную камісію, якая-бы там у працягу 14 дзён пільна здасьледавала ўсе падзеі і здала з іх справаздачу Сойму з трэбаваньнем пакараньня вінаватых. Апрача гэтага, украінцы дамагаюцца звальненьня ваяводы Галухоўскага і выданьня распараджэньняў, забясьпечваючых бясьпечнасьць жыцьця і маемасьці ўкраінцаў і вытаць яшчэ гарэлка, не даючы ўзамен нічога.

С Будны.

Кніга і масы на Захадзе і ў нас.

Нябывалае разьвіцьцё тэхнікі ў XIX стагодзьдзі надзвычайна панізіла цэны на кнігі і зрабіла іх даступнымі найшырэйшым масам грамадзянства. Тое, што дагэтуль было прывілегіяй заможных клясаў, сталася даступным працоўным.

Кніжка зрабілася, ня толькі таварышкай вучонага, ня толькі культурнай разрыўкай сібарыта, але і таварышкай чалавека працуючага ў іншых, ня ўмысловых галінах працы.

Тут яна выконвае дзьве службы: з аднаго боку, яна служыць прыемным адпачынкам, з другога боку, служыць памочнікам і вучыцелем у барацьбе за існаваньне.

Барацьба за існаваньне ў сучасным клясавым грамадзянстве не абмяжоўваецца толькі барацьбой з прыродай, барацьбой, якая знаходзіць свой выраз у працы прамысловай і сельскай, але з неабходнасьцю абыймае і барацьбу сацыяльную, г. з. палітычную барацьбу розных груп і клясаў грамадзянства між сабою.

З таго маманту, як кніга сталася даступнай самым шырокім слаём жыхарства, яна абярнулася ў адну з галоўных прыладаў на гэтых абодвых фронтах барацьбы за існаваньне.

Бязупынная рэвалюцыя ў спосабах і засобах вытворчасьці прамысловай і сельскай, стварэньне ў зьвязку з гэтым цэлага раду новых прафэсіяў, бязупыннае ўскладненьне машын і тварэньне цэлых новых галін вытворчасьці мімаволі прымушалі капітал павысіць зровень веды працоўных.

Пры гэтых варунках пагоня капіталістаў за зыскам упіралася ўвесь час у праблему павышэньня выдайнасьці працы, гэта знача ў хутчэйшае і па магчымасьці дасканальнейшае апанаваньне праз работнікаў новых варштатаў і мэтадаў працы.

Гэтую праблему, пры бязупыннай зьмене тэхнікі, магчыма было вырашыць толькі шляхам паднясьця асьветы шырокіх мас наагул і ідучага поруч са сталымі зьменамі тэхнікі пашырэньня вед шырокіх мас працоўных, па-за ўсякімі школамі.

Насьледкам гэтага было нябывалае ўпрост разьвіцьцё і распаўсюджаньне папулярна-навуковай літэратуры.

Капітал кінуў аграмадныя засобы на гэта.

Тыя-ж самыя прычыны выклікалі і аграмадны запыт на папулярна-навуковую кнігу. Яскравым прыкладам гэтага можа паслужыць Нямеччына са сваім нябывалым упрост багацьцем папулярна-навуковых выдаўніцтваў, а таксама і іншыя высока-прамысловыя краі Захаду. Гэткім чынам, дзякуючы нябываламу разьвіцьцю тэхнікі, кніжка зрабілася неадлучным таварышам чалавека працы, будзячы яго думку, прывучаючы яе да лягічнага, навуковага думаньня; яна зрабілася памочнікам і вучыцелем самых шырокіх мас грамадзянства ў іх барацьбе з прыродай.

Як мы ўжо адзначылі, у клясавым грамадзянстве барацьба за існаваньне не абмяжоўваецца адной барацьбой з прыродай.

Цяжкае становішча працоўных, усё павялічваная розьніца ў існаваньні працоўных і буржуазіі павялічэньне меры эксплёатацыі працоўных, сталая няпэўнасьць і небясьпечанасьць заўтрашняга дня, як вынік капіталістычнай анархіі ў вытворчасьці, пралетарызацыя і поўпэрізацыя (абядненьне) ўсё шырэйшых колаў грамадзянства ў меру разьвіцьця капіталістычнай гаспадаркі, няўхільна мусілі выклікаць вострае змаганьне між працай і капіталам.

У барацьбе гэтых сілаў кніжка пачала граць адну з галоўных роляў. Яна зрабілася адным з галоўных засобаў змаганьня, якое вядзецца арганізацыямі працы і капіталу за розум і душы найшырэйшых мас грамадзянства.

Няма ніякага сумліву, што больш пэўна можа выкарыстаць гэтую засобу той, хто эканамічна дужэйшы. Бязумоўна, гэтая магутная засоба клясавай барацьбы выкарыстоўваецца буржуазіяй у поўнай меры.

У той час, як арганізацыі працоўных імкнуцца пры дапамозе кніг разбудзіць думку, прывучыць яе да аналізу (падрабязнага раскладу) акружаючых зьявішчаў у грамадзянстве, навучыць знаходзіць прычынную сувязь між імі і бачыць пасьлядоўнасьць іх; у той час, калі арганізацыі, бароначыя інтарэсы працоўных, будзяць імкненьне і навучаюць шырокія масы працоўных уплываць на ход гэтых зьявішчаў, умешвацца ў ход надзей,—капітал, зусім зразумела, імкнецца да процілежных мэтаў. З гэтымі мэтамі і створана, а таксама і фінансуецца, гэтым мэтам і служыць уся бульварная літэратура.

Заданьнем гэтай літэратуры, заданьнем гэтых кніг зьяўляецца: адвярнуць увагу шырокіх мас ад аснаўных зьявішчаў грамадзкага жыцьця, зьявішчаў, зачэпліваючых інтарэсы самых шырокіх колаў грамадзянства; адвярнуць увагу гэтых масаў ад прычыннай сувязі, ад прычыннай залежнасьці між гэтымі зьявішчамі і іх вынікамі; прывязаць усю ўвагу найшырэйшых масаў да фактаў, да паасобных фрагмэнтаў жыцьця, нічога ня значучых у жыцьці шырокіх колаў грамадзянства, ня маючых жаднага ўплыву ў іх, каб тым спакайней рабіць свае інтарэсы. Мала гэтага, яна—бульварная літэратура, знарок распаляе ўсякія антысацыяльныя інстынкты, сьвядома імкнучыся разлажыць цесныя шэрагі працоўных, у карані зьніштожыць магчымасьць якой-колечы салідарнасьці і існаваньня арганізацыі. Гэтым вось інтарэсам і служыць бульварная літэратура, і трэба сказаць не без рэзультатаў.

Побач з гарэлкай, бульварная літэратура зьяўляецца адным з страшнейшых бічоў сучаснага грамадзянства. Знаходзячы вялікі збыт сярод шырокіх колаў грамадзянства, перадусім у сфэрах працоўных, бульварная літэратура забірае ад іх той астатак часу і энэргіі, якія яшчэ асталіся пасьля працы, забірае астатні грош, які ня здолела высмактаць яшчэ гарэлка, не даючы ўзамен нічога. Гэткую роль адыгрывае ў жыцьці найшырэйшых мас кніга, калі яна абяртаецца ў засобу ўмацаваньня панаваньня капіталу.

У той-жа самы час, кніжка зрабілася ў руках арганізацыі працоўных засобай мабілізацыі, арганізацыі, засобай спайкі, сцэмэнтаваньня шырокіх мас працоўных у іх барацьбе з капіталам, з вызыскам за свае правы і вызваленьне, засобай уясьненьня сабе гэтымі масамі канечных мэтау, уясьненьня масам шляхоў, вядучых да іх. Яна паслужыла і служыць аб'яднаньню і ўзгадненьню, імкненьню мысьлі і пагляду, ствараючы гэткім чынам магчымасьць масавай салідарнай уплянаванай працы. Толькі дзякуючы ёй, дзякуючы гэтай ролі, якую яна адыграла і адыгрвае, стала магчымым трывалае існаваньне вялікіх цэнтралізаваных грозных для эксплёататараў арганіз. працоўных мас, здольных, дзякуючы сваей трываласьці запраўды прыносіць працоўным карысьць, стала і бязупынна бароначы іх інтарэсы. Бяз кніг, даступных агулу, ня можа быць трывалай магутнай арганізацыі, ня можа быць трывалай еднасьці паміж яе сябрамі—гэтага варунку трывалай уплянаванай на даўжэйшы час працы.

Арганізацыя, сябры якое не прадстаўляюць сабе далейшых мэтаў, шляхоў і спосабаў барацьбы, арганізацыя, сябры якой ня маюць выробленай ідэалёгіі, ня можа мець трывалых сталых уплываў. Яна сама залежыць ад выпадку.

Сказанага даволі, каб зразумець велічэй ролі, якую адыграе кніга ў барацьбе працоўных мас за палепшаньне свайго быту і сваё вызваленьне.

Вось, у агульных рысах тая роля, якую адыграла і адыгрывае на Захадзе кніга ў жыцьці шырокіх мас. На гэтым мы і закончым, пераходзячы да гэтага пытаньня ў нас у варунках Заходняй Беларусі.

(Працяг будзе).

платы адшкадаваньня тым украінцам, якія пацярпелі ў часе падзеяў 1 г. лістапада.

Мусім адзначыць, што 4 раненым (цяжэй) паліцыянтам ужо крыху выплачана адшкадаваньня — аднаму 500 злотых, рэшце па 300 злотых.

З сьвяткаваньня 11 гадаўшчыны камуністычнай улады.

Што году, у дзень паўстаньня камуністычнай улады ў СССР (7 лістапада 1917 г.) камуністы дзяржаваў усяго сьвету стараюцца адсьвяткаваць гэты памятны дзень сваей рэвалюцыі. І польскія камуністы, выступаючы што году ў гэты дзень, выступілі сёлета. Як ён прайшоў на ўсей Польшчы—вельмі трудна сказаць, бо буржуазная прэса гэтага не падае, а іншай дарогай (ня маючы сродкаў на ўтрыманьне ўласных карэспандэнтаў) мы гэтага ня можам знаць.

Каб не наразіць газэту на непатрэбную канфіскату, мы не падаём паважаным чытачам падрабязна навет і тых фактаў аб гэтым дні, якія ёсьць у буржуазнай прэсе. Мы толькі коратка падаём, што камуністычныя выступленьні ў чэсьць 11-годзьдзя камуністычнай улады ў Радавых Рэспубліках адбываліся па ўсей Польшчы — як у большых і меншых гарадох і навет на правінцыі самай Польшчы, так і на „Крэсах". Напрыклад, у Варшаве былі сфармаваны камуністычныя дэманстрацыйныя паходы на рагу вуліцаў Панскай і Мядзянай, на рагу вул. Лешно і Жалезнай, на вуліцы Сьв.-Азёрскай, на вул. Раціавіцкай (проці фабрыкі Макарэвіча), на вул. Дзікай, Стаўкі, пляц Каз. Вельскага і інш. Апрача гэтага, прэса падае і аб багатым „удэкараваньні" камуністычнымі сьцягамі з агітацыйнымі надпісамі тэлеграфных слупаў і сьцэнаў.

Разумеецца, не абышлося і бяз арыштаў і рэвізіяў, лік якіх штосьці ня падаецца буржуазнай прэсай.

Узрост коштаў пражыцьця.

Галоўны Статыстычны Урад у Варшаве падае, што ў верасьні ў параўнаньні з жніўнем кошты пражыцьця былі зьменшыліся на 0,04 прац., але ў кастрычніку ў параўнаньні з верасьнем узрасьлі на 0,1 працэнта.

Цікава было-б ведаць, на колькі падаражэла ўжо ўсё ў Віленшчыне. Што-ж будзе зімой, — калі селяніну ня хопіць да Каляд ня толькі хлеба, але й бульбы?...

Забастоўка ў Халме.

У Халме выбухла забастоўка кравецкіх работнікаў — т. з. тандэтнікаў. Яны дамагаюцца 37 прац. падбаўкі платы.

Забастоўка ў вугальных капальнях.

У вугальных капальнях у Явожыне выбухла забастоўка. Яна выклікана адкіненьнем жаданьняў машыністаў, якія дамагаюцца зьмены працы і платы і выбараў дэлегатаў у работніцкія рады, якіх ня было ўжо некалькі гадоў.

Перамога забастоўкі ў „Аэролёце".

У Варшаве скончылася забастоўка працаўнікоў цывільнага лётніцтва ў „Аэролёце". Прамыслоўцы згадзіліся на супольны разгляд работніцкіх жаданьняў падбаўкі.

Як бачым, дык барацьба працы з капіталістычным вызыскам робіцца што далей, то больш упартаю і што далей, то больш перамога перахіляецца на бок работнікаў.

Яшчэ шпікоўства.

Акружны Суд у Катавіцах прыгаварыў на 2 гады цяжкага вастрогу і пазбаўленьне праў грам. Антося і Паўла Стандуроў.

Названыя абвінавачваліся ў шпікоўстве на карысьць Нямеччыны ў замаху на мабілізацыйныя дакуманты.

Таямнічы выбух бомбы ў Кракаве.

У камянярскім прадпрыемстве Франчака ў Кракаве здарыўся таямнічы выбух бомбы, якая знаходзілася ў пакунку, атрыманым па пошце гаспадаром прадпрыемства—Франчакам.

Выбухла яна — калі Франчак разьбіраў пакунак. Апрача Франчака, больш ахвяраў няма.

Заграніцай.

Сакко і Ванцэтті нявінна страцілі жыцьцё.

Мінуў год з таго часу, як два італьянцы — анархістыя Сакко і Ванцэтті, скараныя амэрыканскім судом на кару сьмерці, страцілі сваё жыцьцё на электрычным крэсьле. Абвінавачвалі іх за забойства касіра і аграбленьне касы для мэтаў палітычных. Ня глядзячы та тое, што ніякіх выразных доказаў іх віноўнасьці ня было, а былі толькі фальшывыя даносы, амэрыканскія ўлады нявінна трымалі іх у турме аж сем гадоў. Работнікі ўсяго сьвету заступіліся за сваіх братоў — работнікаў, выносячы мільёны пратэстаў з дамаганьнем звальненьня нявінна трыманых Сакко і Ванцэтті. Аднак, нічога гэта не памагло. 22-га жніўня л. г. амэрыканскі ўрад выканаў свой прысуд, навет прэзыдэнт КуліДж не захацеў скарыстаць з дадзенага яму „права ласкі".

Нядаўна адна з вялікіх амэрыканскіх газэтаў, выходзячая ў Чыкаго, падала сэнсацыйныя рэвэляцыі аб тым, што Сакко і Ванцэтті былі нявінна пакараны. Прычынай гэтых рэвэляцыяў паслужыла дабравольнае прызнаньне аднаго крыміналістага па прозьвішчу Сільва, які нядаўна выйшаў з вастрогу. Прызнаўся ён, што гэта ён сем гадоў таму назад з іншымі бандытамі зрабіў напад на касіра і што Сакко і Ванцэтті пры гэтым ня было.

Дык нарэшце шыла вылезла з мяшка. Пратэсты работнікаў усяго сьвету даказалі слушнасьць сваіх дамаганьняў. Амэрыканская буржуазія можа пацяшацца з „справядлівасьці" і спраўнасьці сваіх судоў.

Буржуазная прэса падае гэту вестку, аднак, з вялікай засьцярогай.

Новае назначэньне А. Ульянава.

А. Ульянаў, які быў даўжэйшы час радцам радавага пасольства ў Варшаве, назначаны, як даносяць з Варшавы, прадстаўніком Народнага Камісарыяту загран. спраў пры Беларускай Сац. Рэспубліцы ў Менску—на мейсца Казімава, які пераведзены ў Маскву.

Камуністычны кангрэс балтыцкіх дзяржаваў ў Дынабургу.

У кастрычніку адбыўся ў Дынабургу (канспірацыйны?) зьезд дэлегатаў камун. партыяў Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі і Польшчы. Пасьля дакладаў дэлегатаў аб палітычным палажэньні ў іх краёх і абшырнай дыскусіі ў гэтай справе—прыняты плян дзеяльнасьці на прышласьць. Кангрэс пастанавіў, паміж іншым, — апрацаваць супольную лінію дзеяльнасьці і ўзаемнай дапамогі — з пагляду на супольнасьць інтарэсаў арганізацыяў у гэтых краёх. Наступны кангрэс мае быццам адбыцца ў Тальліне — у першых месяцах новага году. („Дзен. Віл.").

Мільён даляраў—на арганізацыю польскага вывазу ў СССР.

На гэтых днях у Маскву выехаў старшыня польска-расейскага гандлёвага таварыства—„Поль-Росс'у" — п. Скэмпскі, які мае даручэньне завязаць стасункі з гандлёвымі і ўрадавымі коламі ў СССР—у мэтах арганізацыі правільнага вывазу тавараў з Польшчы ў СССР. Таварыства „Поль-Росс" атрымала, як даносяць газэты, ад польскага ўраду на гэтую мэту 1 мільён даляраў.

Проці-польскія маніфэстацыі ў Радавай Украіне.

„АТЕ" даведалася, што ў Харкаве, Кіяве, Адэсе, Палтаве і ў іншых местах Радавай Украіны адбыліся—(ў зьвязку з „сьвяткаваньнем" 10-х угодкаў польскай перамогі ў Галіччыне) масавыя проці-польскія дэманстрацыі.

На шмат-людных мітынгах гаварыліся вельмі вострыя прамовы і прымаліся нямеш вострыя рэзалюцыі проці ўціску украінскага насяленьня ў Польшчы,—з заклікам украінскага пралетарыяту і сялянства да барацьбы з „польскім імпэрыялізмам"...

Ангелійская прэса аб польска-літоўскім споры.

У апошнія дні шэраг найпаважнейшых англійскіх часопісаў зьмясьцілі артыкулы ў справе польска-літоўскага спору — з пункту гледжаньня Англіі—трэба думаць—у сувязі з узнаўленьнем польска-літоўскіх перагавораў у Кэнігсбэргу. Ведамы Аргус у „Інгліш Рэвью" — у артыкуле „Эўропа глядзіць на Вільню" разглядае сутнасьць польска-літоўскага спору і даходзіць да вываду, што — у інтарэсах эўрапэйскага міру—сучаснае тэрытарыяльнае палажэньне Літвы ня можа быць зьменена — ані на карысьць Польшчы, ані на карысьць Літвы...

У іншай часопісі Р. Мэкрэй у артыкуле „Мір над Балтыкай" асуджае палітыку Вальдэмараса, падчыркваючы, што Польшча ўжо цьвёрда стала над Балтыкай. Урэшце ў іншай вельмі салідная часопісі майёр Ньюмэн—у арт. „Англія над Балтыкай" падчырквае важнасьць для англійскіх марскіх інтарэсаў над Балтыкай падтрыманьня Польшчы і іншых балтыцкіх дзяржаваў, а таксама — зьліквідаваньня „шкоднай ролі Літвы, як прыладу варожай міру палітыкі Нямеччыны і СССР".

Замах украінца на польскага консула ў Празе.

31/X у Празе зроблены замах на польскага консула Любачэўскага. Замах зроблены ўкраінскім эмігрантам Пасюком, які стрэліў у консула ў сенях консульства, але ня трапіў. Пасюк—арыштаваны. Замахоўца—паходзіць з Галіччыны. На дапросе ён заявіў, што акт яго мае палітычны характар—„помсты ненавіснай польскай дзяржаве" — якраз 31/X—у дзень угодкаў распачацьця ўкраінскага паўстаньня і абвешчаньня незалежнасьці Украіны. „ПАТ", падаючы гэтыя весткі, сьцьвярджае, што замах трэба лічыць — ня актам асабістай помсты, але — дэманстрацыяй палітычнага характару.

Скасаваньне кары сьмерці ў Нямеччыне.

Праўная камісія Рэйхстагу прыняла тымчасовы праект закону аб скасаваньні кары сьмерці. За праект галасавалі — сацыялісты, дэмакраты, камуністы і людоўцы. Рэшта буржуазных партыяў, праціўнікаў праекту, устрымаліся ад галасаваньня.

Вялізарны крызіс ў нямецкай прамысловасьці.

Выкіданьне работнікаў (так званы „локаўт") у мэталёвай прамысловасьці ў заходніх правінцыях Нямеччыны ўжо пачалося. Найвялікшыя фірмы—„Крупп", „Тіссэн", „Рэйнштальʼ адмовілі працы большасьці работнікаў. Гэты „локаўт" пазбавіць працы каля мільёну работнікаў. Працадаўцы пастанавілі цягнуць такі стан на заводах датуль, дакуль ня будзе зьменены карысны д[ля] работнікаў прысуд палюбоўнага суду.

Апрача таго, амаль ня столькі-ж работнікаў пазбаўлена працы — дзякуючы локаўтам і забастоўкам у тканіннай прамысловасьці. Такім чынам армія безработных павялічылася ў Нямеччыне, хіба-ж часова—на 2 мільёны работнікаў.

Перамога англійскіх работнікаў

У Англіі нядаўна адбываліся выбары ў англійскія самаўрады. Згодна апошніх вестак, англійская работніцкая партыя (Лябур Парты) атрымала новых 107 мандатаў. Кансэрватары страцілі 61 мандат, лібэралы 50 мандатаў. Колькі мандатаў атрымалі англійскія камуністы, газэты не падаюць.

Як англійскія ўрадоўцы адбываюць падарожжу па Індыі.

Да Індыі прыехала камісія, назначаная англійскім урадам для зьмены канстытуцыі ў Індыі. Нездаволеныя індыйцы зрабілі ў м. Лагор варожую да англійцаў дэманстрацыю. Дэманстранты прабавалі прабрацца праз загароду, зробленую англійцамі з калючага дроту. За загародай знаходзіліся сільныя аддзелы англійскай паліцыі. Стрэламі паліцыі ранена 19 чалавек і некалькі забіта.

Дзеля абароны гэтай камісіі ў часе яе падарожжы з м. Поона ў м. Лагор быў назначаны сільны паліцэйскі патруль. Праз усю жалезнадарожную лінію на працягу 1.300 анг. міляў былі выстаўлены вайсковыя пастарункі. Перад станцыяй Лагор выстаўлены танкі.

Як бачым, панаваньне англійцаў у Індыі ня можна лічыць вельмі прыемным. „Можна кіраваць штыком, але на штыках усядзець цяжка", — сказаў Напалеон і... за жыцьця перakanаўся ў гэтым. Пэўне ж і англійцы пакрысе ў гэтым пераконваюцца.

Габінэт міністраў Пуанкарэ трашчыць.

Склееных з такой натугай францускі габінэт міністраў на чале з вядомым Пуанкарэ зноў трашчыць. Дарваўшыся да ўлады, Пуанкарэ пачаў варочаць правы, а з імі і вялікія зямельныя абшары каталіцкаму духавенству, ад якіх, пара гадоў таму назад, сацыялістычны ўрад Францыі нацыяналізаваў гэтыя абшары. Пад націскам працоўных некаторыя міністры-сацыялісты дамагаюцца, каб папярэдні загад сацыялістычнага ўраду застаўся ў сіле. І вось, у „коаліцыйным урадзе" закіпела, як у катле: — нацыяналісты сваё, а сацыялісты сваё. Нарэшце Пуанкарэ запрапанаваў кампраміcавую ўхвалу, каб, як кажуць, і воўк быў сыт і козы цэлы. Як да гэтага аднясьліся сацыялісты, газэты не падаюць, але-ж можна быць пэўнымі, што сацыялісты-угадоўцы і на гэты раз уступяць сваёй роднай буржуазіі.

Румынскі ўрад—вора [п]асьветы.

Пасьля заканчэньня сусьветнай вайны ў 1918 годзе, „шчодрая Антанта" надзяліла Румынію чужымі землямі, належачымі раней да даўняй Расеі, Аўстрыі і Вэнгрыі. Навет не пастыдалася Румынія адабраць ад маленькай Баўгарыі чыста баўгарскую Дабруджу. Такім чынам Румынія вырасла з сямімільёнавай у 17-ці мільёнавую дзяржаву. У граніцы Румыніі папала шмат іншых народаў, нічога супольнага з румынамі ня маючых, напр. немцаў, вэнграў, украінцаў, расейцаў і інш. Румынскі ўрад, хочучы перарабіць гэтых інародцаў у румынаў, перш за ўсё скасаваў усе іхнія школы, а паадчыняў на іх месца румынскія. Разумеецца, усе гэтыя нацыянальныя меншасьці дружна запратэставалі праціў прымусовай румынізацыі і дзяцей сваіх у румынскія школы не пасылаюць, а пасылаюць у свае тайныя прыватныя школы. Румынскія жандармы жорстка расправуляюцца з бацькамі, калі ўдасца выкрыць ім гэтыя тайныя школы.

Цёмная і некультурная Румынія трымае у цемнаце іншыя культурнейшыя за сябе нацыянальныя меншасьці.

Нядаўна немцы і вэнгры склікалі вялікі сход, на якім востра дамагаліся, каб румынскі ўрад забраў ад іх румынскія школы і наагул ня ставіў ніякіх перашкодаў у культурным разьвіцьці нацыяльнаных меншасьцяў. Напужаліся румыны немцаў і пачалі на сьпех пісаць розныя законы ў гэтым кірунку. Міністар так раздабрыўся, што прызнаў аж 20 тысяч дапамогі прыватным школам нац. меншасьцяў. Далей думае ўрад правесьці школьны плебісцыт і на падставе яго адчыніць такія школы, якіх будзе дамагацца насельніцтва. Ад гэтага часу будуць бацькі рашаць пра мову, у якой павінны вучыцца іх дзеці, а ня ўрад. Добра было-б, каб ад некультурнай Румыніі ўзялі нарэшце прыклад і інш. некаторыя суседнія дзяржавы.

Рэпрэсіі ў Югаславіі пашыраюцца.

Югаслаўскі ўрад спужаўся ўзмацненьня агітацыі харвацкіх апазіцыянэраў. Рэпрэсіі пашыраюцца з кожным днём. Вастрогі запаўняюцца арыштаванымі. Апазіцыйныя газэты канфіскуюцца. Галоўны рэдактар газэты „Народни Вал" арыштаваны. Закідаюць яму напісаньне артыкулу, востра скіраванага праціў караля. У гэтым артыкуле рэдактар называе караля супольнікам забойцаў павадыра харватаў пасла Сьцяпана Радзіча.

Закладайце свае, беларускія, каапэратывы.

Каапэрацыя — гэта шлях да перабудовы грамадзкага ладу на новых, больш справядлівых падставах.

Каапэрацыя — гэта адзін з відаў сацыяльнай барацьбы працоўных за лепшую будучыню.

Дык твары каапэрацыю і абмінай прыватнага гандляра, як заразу!

Наша хроніка.

Канфіската. Па загаду Гарадзкога Старасты на м. Вільню, сканфіскаваны № 3 газэты „За Працу", за: 1) перадавіцу—„**За будучыню**", 2) „**З Сойму**", 3) З палітычн. хронікі—„**Польшча шукае выхаду**", „**Масавыя арышты „камуністаў" на Украіне**, „**Камуністычныя „авантуры"**, **Пашырэньне сялянска-работніцка руху ў Польшчы**, 4) фэльетон—**Як канфіскуецца газэта** і 5) за заметку з нашай хронікі—**Забастоўка ў фабрыцы „Балтык"**.

Звальненьне з вастрогу А. Канчэўскага. На гэтых днях зволнены з вастрогу грам. А. Канчэўскі, ведамы беларускі грамадзкі дзеяч. Грам. А. Канчэўскі прасядзеў па розных турмах ад 1924 г., г. ё. чатыры гады і засуджаны за прыналежнасьць да Беларускай Рэвалюцыйнай Арганізацыі.

Абвестка. У Слоніме дня 21-га лістапада у 12 гадзіне дня ў памяшчэньні пры Уланскай вуліцы № 8 адбудзецца Агульны Сход дэлегатаў ад Гурткоў Т-ва Беларускае Школы Слонімскага павету дзеля выбару Слонімскае Акружнае Управы і Наглядная Рады, а таксама дзеля выбару двох дэлегатаў ад Слонімскага Вокругу на Агульны Сход у Вільні Таварыства Белар. Школы.

Вільня 2.XI 1928 г. — **Дачасная Паўнамоцная Камісія.**

Календар на 1929 год. Надных выходзіць у сьвет кніжка-календар на 1929 г. Выдавецкага Т-ва. Кніжка ў два—тры разы вялікшая, чым у мінулым годзе. Зьмест вельмі багаты. Пералічым важнейшыя стацьці, якія ўжо ўвайшлі ў календар па наступных аддзелах: 1) **Літэратурны:** народныя песьні, запісаныя ў Пружаншчыне; вершы нашага заходняга „Маладняка"; апавяданьне—„З усходніх загонаў" — літэратурны агляд: 2) **Гістарычны:** Кароткі агляд гісторыі Беларусі. Беларускі гістарычны календар; 10-ці гадовы юбілей Віленскае Беларускае Гімназіі; 400-ыя ўгодкі першага Кадэксу беларускага права; Жыцьцё і праца Ів. Луцкевіча; 3) **Культурна-грамадзкі аддзел:** Скарбы беларускага музэю ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні; Што зрабіла першая Акадэмічная Канфэрэнцыя ў Менску ў справе рэформы беларускага правапісу і азбукі; Праца ў нашых самаўрадах; 4) **Школьны аддзел:** Аб арганізацыі беларускае працоўнае школы; З афіцыяльнае школьнае статыстыкі; Афіцыяльны сьпіс існуючых у нас беларускіх і польска-беларускіх школаў; Лік пададзеных дэкляраціяў на беларускія школы; За родную школу; 5) **Пазашкольная асьвета:** Культурна-асьветная праца ў гуртках Т-ва Белар. Школы; 6) **Гаспадарчы аддзел:** Шматпольле і пладазьмен; Як прывясьці ў парадак запушчаны сад; Агарод каля хаты; Лекарскія зёлкі; Лячэньне хатняе жывёлы; Гаспадарчыя парады; 7) **Каапэрацыйны аддзел:** Асновы каапэрацыі; Віды каапэрацыі; Беларускі Каапэратыўны Банк.

Як відаць з гэтага пераліку, календар носіць характар строга культурны. Тыя аддзелы, друкаваньне якіх заканчваецца (адміністрацыйны, юрыдычны, мэдыцынскі і інфармацыйны), маюць на мэце здаволіць практычныя патрэбы нашага сялянства.

У Календары зьмешчана да 30 фатаграфіяў павятовых зьездаў Т-ва Белар. Школы, народных дамоў, драматычных і музыкальных гурткоў, бібліятэк-чытальняў і т. д., так-жа некалькі малюнкаў беларускіх стылёвых хат у выкананьні ведамага мастака Язэпа Драздовіча. Апрача таго, у календары будуць зьмешчаны фатаграфіі ўсіх беларускіх паслоў.

Кніжка будзе каштаваць 1 зл. 50 гр., мо' мавет трошкі даражэй. У справе заказаў зварачвацца на адрасу: „Wilno, ul. Ostrobramska № 1, Białoruska księgarnia".

Лекцыі ў Студ. Саюзе. Нас просяць паведаміць, што на наступную нядзелю запрошаны для чытаньня лекцыяў кс. Адам Станкевіч і д-р І. Дварчанін. Аб месцы лекцыяў будзе падана ў паведамленьнях.

Камітэт дапамогі ў Амэрыцы. Як нам пішуць, у Амэрыцы з'арганізаваўся „Камітэт дапамогі сялянам і работнікам Зах. Беларусі". Камітэт мае ўжо свае аддзелы ў Нью-Іорку і Чыкаго, а таксама распаўсюджвае сваю дзеяльнасьць і на іншыя цэнтры, дзе знаходзяцца работнікі-беларусы. Камітэт вядзе прапаганду між работнікамі-беларусамі а мэтай зборкі ахвяраў для дапамогі сваім братом на Бацькаўшчыне. Трэба вітаць гэтыя пачынаньні заакіянскіх братоў, якія зразумелі наша палажэньне, дзе мы маглі дасюль разьлічваць толькі на свае ўласныя сілы.

Новыя кніжкі. Выйшлі з друку і паступілі ў продаж кніжкі: „**Рунь Веснаходу**"— зборнік вершаў паэтаў і пісьменьнікаў Зах. Беларусі і „**З сучаснае прозы Нямеччыны**" — М. Гнатышака, пераклад з украінскае мовы А. Бартуля. Абедзьве кніжкі выданьня Беларускага Выдавецкага Т-ва. Цікавасьць узбуджае першая з іх. Да агляду яе вернемся ў наступных нумарох.

Акадэмія ў Віленскай Белар. Гімназіі. Вечарам 3 га лістапада ў салі Віленскай Беларускай Гімназіі адбылася Акадэмія вучняў той-жа гімназіі, пасьвечаная памяці 20-х угодкаў літэратурна-грамадзкай працы беларускага пісьменьніка **Цішкі Гартнага** (Зьмітра Жылуновіча).

Зьмест акадэміі быў вельмі багаты і цікавы: 1) рэфэрат вучня 7 кл. Адама Міскі, 2) дэклямацыі, 3) хор і 4) аркестра.

Саля была прыгожа ўдэкаравана, пасярод якой вісеў намаляваны спэцыяльна для гэтай урачыстасьці вялізны адбітак (партрэт) Ц. Гартнага.

Публікі было надта многа — аж да цеснаты.

Яшчэ перад распачацьцем Акадэміі на сабранае грамадзянства зрабіла вельмі добрае ўражаньне прыгожая і старанная дэкарацыя салі, якая ўжо сьведчыла, як шчыра аднесьліся вучні Віл. Белар. Гімназіі да роднай культуры і працаўнікоў на яе ніве, а разам і змагароў за лепшую будучыню нашага працоўнага народу. Гэткае-ж самае стараньне выявілася ў праведзеньні ўсей Акадэміі, гэтымі запраўднымі сынамі нашай сярмяжнай Бацькаўшчыны.

І ад рэферату і ад дэклямацыяў усё грамадзянства было проста ў захопленьні. Асабліва ўзрос урачысты настрой, калі на сцэну выступіў шырока ўжо вядомы гімназіяльны хор, пад кіраўніцтвам вядомага працаўніка на белар. культурнай ніве, грам. Шырмы.

Акадэмія закончылася дружным сьпевам, як хору, так і ўсяго прысутнага грамадзянства: „Ад веку мы спалі".

У часе Акадэміі вучні Віл. Белар. Гімназіі выслалі Цішчы Гартнаму прывітальную тэлеграму ў Б.С.С.Р., дзе ён пражывае.

Цікава адзначыць, што на гэтай урачыстасьці былі прысутнымі толькі тры падагогі: дырэктар Стоцкевіч, грам. А. Луцкевіч і гр. Гаўрылікава (жонка пасла Белар. Сял.-Раб. Клюбу), а рэшта „дыплёматычна захварэла".

Ну што-ж, урачыстасьць сьвяткаваньня нашага пралетарскага пісьменьніка нескольки не пацярпела ад адсутнасьці асоб, якім пот працы дражніць іх панскія насы.

Літоўцы ўсё лятаюць, а бальшавікі ўсё высылаюць. Апошняя прэса паведамляе, што ў раёне Слабодкі (на польскім абшары) доўга лятаў літоўскі самалёт.

Тая-ж самая прэса інфармуе, што нядаўна бальшавікі выслалі ў Польшчу 49 чалавек, сярод якіх падае: 9 былых палітвязьняў, 4 палякоў і 11 жыдоў.

Дзіўна, што, падаючы досыць часта інфармацыі аб прымусовым і непрымусовым выезьдзе жыдоў з СССР у заграніцу (найбольш у Польшчу), тая-ж самая прэса любіць пісаць аб нейкім выключна „жыдоўскім раі" ў Радавых Рэспубліках.

Літоўскія „правакацыі". Апошняя польская прэса падае цэлы рад літоўскіх „правакацыяў". Напрыклад—літоўцы абстралялі густым карабінавым агнём польскі патруль. Тут-жа прэса прыпамінае, што ў свай час, пры такіх-жа варунках, быў застрэлены літоўцамі польскі жаўнер (у раёне Паддубя).

У раёне Друсгенікаў літоўцы бышцам беспадстаўна арыштавалі аж 9 польскіх грамадзян, лёс якіх польскім уладам не ведамы.

На возеры Шэмёт літоўцы бышцам бяспраўна арыштавалі 4-х польскіх рыбакоў і ня гледзячы ні на якія старанні польскіх уладаў, ня хочуць іх выдаць палякам.

Наагул, у апошнія часы на літоўска-польскай граніцы нешта робіцца.

Суд над камуністам. Прэса інфармуе што Акружны суд у Беластоку прыгаварыў некага Л. Льва на 6 гадоў цяжкай турмы. Льву закідалася камуністычная дзейнасьць і прапаганда выўратовых ідэяў сярод палітвязьняў.

„Кам'ячэйка". Буржуазная прэса інфармуе аб зьліквідаваньні з г. м. „кам'ячэйкі" ў раёне Стахоўшчыны і Рубяжэвічаў.

Арыштавана Андрэя Чэрчакова, бышцам сябру Цэнтр. Кам. КПЗБ і яшчэ 7 чалавек. Пры ўсіх іх, бышцам, знойдзены вялізарны лік камуністычнай бібулы.

Злоўлены ўцёкшы палітвязень? У пачатку верасьня г. г. з Лукішскага вастрогу ў Вільні на суд у Глыбокае былі перавезены 3 палітвязьні, абвінавачаныя ў камунізьме, Мажэй, Валасовіч і Сіняўскі. На другі дзень па „навасельлі" названыя палітвязьні ўцяклі з Глыбоцкага вастрогу і аб іх і сьлед прапаў.

Прэса інфармуе, што польскія пагранічныя ўлады затрымалі пракрадаючагася на бок Радавых Рэспублік чалавека, які бышцам прызнаўся, што ён ёсьць уцёкшы з Глыбоцкага вастрогу Сіняўскі. Аб свіх таварышох ён бышцам кажа, што яны ўжо заграніцай.

Злавілі шпіна. Прэса падае, што на польска-літоўскім пагранічы ў раёне Пілінова, польскія ўлады арыштавалі нейкага Шаткоўскага, які западазраецца ў шпіёнстве на карысьць суседняй дзяржавы.

Узрост безработцья ў Вільні. Згодна з буржуазнай прэсай, у мінулым тыдні ў Вільні зарэгістравана 2382 безработных. У параўнаньні з папярэднім тыднем безработцье павялічылася на 80 чалавек.

Мусім адзначыць, што гэта далёка ня ўсе безработныя, бо дужа іх не зарэгістраваных шукае працы, а яшчэ больш шукае сякога такога выхаду ад пагражаючай галоднай сьмерці, хоць-бы і ў выезьдзе за граніцу. Але й тут ня без бяды — бо многія апякліся на заработках у Францыі, а ў другіх няма за што выехаць, ня толькі ў Францыю, але і за Вільню.

Зьменьшэньне работнікаў. У апошнія часы фабрыка паперы ў Н.-Вэрках звольніла аж 100 работнікаў. Гэта называецца „рацыяналізацыя працы"—выкінуць сотню работнікаў на брук.

З Т-ва Бел. Школы.

З працы Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

13 кастрычніка с. г. драматычная сэкцыя Беластоцкага Гуртка Т-ва Бел. Школы ладзіла ў г. Беластоку спэктакль-вечарыну.

Ставілі: „Страхі жыцьця" драму ў 3-х актах Аляхновіча і „Зьбянтэжаны Саўка" — жарт у 1 дзеі — Родзевіча.

Спэктакль даў поўны збор і прайшоў пры паднятым настроі прысутных.

П а д з я к а.

Сьвіслацкая Акружная Управа Т-ва Бел. Школы ладзіла дня 19 і 20 жніўня с.г. збор ахвяр грашыма.

Збор прашоў бяз інцыдэнтаў, калі ня браць пад увагу цынізм засьлепленых шовіністаў да асоб, зьбіраўшых ахвяры.

Сабрана на м. Сьвіслачы і некаторых бліжэйшых вёсках усяго 103 зл. 81 грош.

Усім ахвярадаўцам, якія зложылі ахвяры на разьвіцьцё роднай асьветы, а таксама і тым, якія прыймалі ўдзел у зборы—Акружная Управа складае шчырае дзякуй!

Акружная Управа.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Пасольскі мітынг.

(Ас. Жалезьніца, Баранавіцкага пав.).

За некалькі дзён да Пакроваў усе вёскі Гарадзскае і бліжэйшыя вёскі Моўчадзкае і Пачапаўскае гмінаў абляцела вестка, што паслы Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу Гаўрылік і Валынец будуць ладзіць у асадзе Жалезьніцы пасольскі мітынг. Дзеля таго, што ні былыя, ні цяперашнія сялянска-работніцкія паслы да нашай мясцовасьці ніколі не прыяжджалі, вестка аб мітынгу выклікала агульнае зацікаўленьне сярод навакольных сялян. Усе напружана чакалі рэзультатаў паданае пасламі Навагрудзкаму Ваяводзе просьбы ў справе дазволу на мітынг... Нарэшце наступіў даўно чаканы мамэнт, калі паслы павінны былі прыехаць з Вільні. Група сялян з в. Кацьмінаўцаў і Ярашова з вялікай радасьцю спаткалі іх у 12 гадз. уначы на глухім паўстанку Мордзічы і запрасілі на адпачынак у в. Ярашова. Першае пытаньне, скіраванае да паслоў, было аб тым, ці ёсьць дазвол на мітынг. Аказалася, што паслы ня толькі ня мелі на руках дазволу, але й ня ведалі, ці польская ўлада дасьць яго...

14-га кастрычніка на Пакровы паслы з в. Ярашова прыйшлі пехатой у Жалезьніцу, куды адначасна большымі і меншымі грамадкамі цягнуліся з розных вёсак сяляне. Добрая пагода ў гэты дзень спрыяла вялікаму наплыву жадаючых паслухаць роднае беларускае слова сваіх выбранцаў. На мейсцы хутка выясьнілася, што ладзіць мітынг улада дазволіла і аставалася толькі чакаць заканчэньня набажэнства ў царкве, калі можна было, паводле праграмы, распачаць прамовы. Але замест таго, каб згодна са звычаем скончыць службу ў царкве а 1 гадз.; жалезьніцкі поп цягнуў яе ажно да 3 гадз. Прычыны, зразумела, усім вядомыя...

Урэшце на ўзгорку каля царквы сабраўся тысячны натоўп сялян. Пасол Гаўрылік распачаў сваю прамову гістарычным аглядам жыцьця беларускага народу, намаляваў абраз адносінаў да яго ў розныя пэрыяды часу суседніх дзяржаваў і высьвятліў прычыны яго нацыянальнага і культурнага ўпадку. Сяляне віталі яго прамову дружнымі воплескамі. Калі, паміж іншым, пачаў ён гаварыць аб неадпаведнасьці камасацыі да сучаснага зямельнага стану беларускага земляроба, сяляне крычалі: „Прэч з камасацыяй"! З вялікім энтузіязмам была таксама спаткана прамова пасла Валынца, які даў справаздачу аб працы Бел. Сял.-Раб. Клюбу і аб адносінах да яго польскіх і беларускіх угодовых партыяў. Уканцы была вынесена некалькі рэзалюцыяў. На заканчэньне мітынгу сяляне бурна віталі прамоўцаў.

Пасьля мітынгу паваж. паслы з вялікай грамадой сялян пайшлі ў в. Кацьмінаўцы, дзе ў 8 гадз. быў наладжаны працаўнікамі Гуртка Т-ва Бел. Шк. спэктакль-вечарына: драма „Страхі Жыцьця", дэклямаваньне вершаў, сьпеў хорам і скокі. Галоўнымі ініцыятарамі гэтае вечарыны былі: Анатолі Квітко, Васіліса Камар і Сьпірыдон Кунцэвіч. Прысутных было каля 140 асоб. Усе былі вельмі задаволены вечарынай, чысты даход ад якое пайшоў выключна на культурна-асьветныя мэты.

Сьмела можна сказаць, што дзень 14-га кастрычніка быў для нашае ваколіцы падвойным сьвятам...

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

— **Навагрудчына, в. Гірычы.** У гэтым месяцы некалькі нашых сялян, напіўшыся, ехалі з кірмашу і на дарозе ў іх паўстала нейкае „непаразуменьне" (што звычайна бывае ў п'яных) і яны пачалі біцца.

Вынікі вядомыя: аднаму галаву разьбілі, другому бакі добра набілі і т. д. Усё гэта вынікі цемры, якая яшчэ ня выбілася з нашай вёскі.

Браты! Пакіньце п'янства. Вы ведаеце, што гэта на руку нашым ворагам, якім хочацца аб тое, каб сеяць варожасьць паміж сялянамі і работнікамі і аслабіць ваш супольны фронт.

Замест таго, каб прапіваць запрацаваныя крывёю і потам грошы, аддайце іх на культурна-асьветную працу, выпішце беларускую радыкальную газэту „За Працу", дзе вы даведаецеся аб праўдзе, аб тым, як працоўны народ павінен змагацца за свае правы і як ён ужо змагаецца. Як трэба дамагацца роднае школы і для чаго яна патрэбная.

Дык да працы! Т—разак.

— **У Валожынскім павеце** знаходзяцца такія „чалавечкі", якія за панскія грошы „садзяць" нявінных людзей. Першым такім быў Я. Сьліж, які „пасадзіў" яшчэ ў 1927 г. 35 чалавек, над якімі цяпер адбыўся ў Вільні працэс. Другім, ужо менш вядомым, зьяўляецца Эдвард Шпік, які пражывае ў Вішневе, дзе служыў камэндантам паліцыі. Цяпер езьдзіць усюды і „шукае" нейкае арганізацыі. Апроч таго, сам запісвае нібыта ў нейкую „падпольную" арганізацыю, каб гэтым злавіць лёгкаверных у пятлю.

Сьвядомыя сяляне павінны гэтага правакатара гнаць вон ад сябе. Зоркі.

— **У Ражанскім надлясьніцтве** лясьнік Лазінскі напісаў пратакол на двох сялян за тое, што іхняе быдла ўвайшло ў „жондовы" лес. Цяпер гэтым сялянам прыйшло плаціць кару ў суме 120 зл. Справядлівы.

— **У вёсцы Завыкі, Дамброўскай вол., Лідзкага павету** ёсьць поп Васіль Мышкоўскі. Мае ён аж 40 дзесяцін парахвіяльнай зямлі, у той час, як нашыя гаротныя сяляне душацца на сваіх шнурках-палосках. Але гэтага яму мала. Ен неміласэрдна абдзірае сялян. Гэтак за вянец бярэ 50 зл., за хрэсьбіны—5 зл., за пахароны—30 зл. Апрача таго, прадае лес, які належыць да ўсіх парахвіян, або ставіць для сябе розныя будынкі.

— **У Вайстамскай вол., Вялейскага пав.** жыхары гэтай вол. зусім амаль пазбаўлены лякарскай помачы. Соймікавы дактарскі пункт ад вёсак гэтай вол. знаходзіцца на адлежнасьці 15—20 вёрст. У Вайстаме-ж ёсьць фэльчар, які знаецца на хваробе, „як сьвіньня на перцы", а тымчасам за візыт бярэ 5 зл., а калі выяжджае, то злупіць 8—10 зл. Зельле-ж дае „свайго вырабу", якое памагае хвораму, як памёршаму кадзіла.

Вэтэрынар таксама „здорава" лупіць. Калі выедзе за 4—5 вёрст, то бярэ 7—8 зл. Сымон Зорка.

— **У м-ку Відзах, Браслаўскага пав.** пэпээсы абвесьцілі „Wielki zjazd PPS" і „Wielki wiec" на 11 гадз. 30. IX—28 г. Тымчасам з усяго гэтага „вялікага" выйшла надта малое, бо да пэпээсаўскіх „panów towarzyszów" прыйшлі толькі некалькі падросткаў і пару старыхоў, так што замеры і пляны іх, як яны самі кажуць, „spełzli na niczem". Гэта, як ня трэба лепей, сьведчыць аб тым, што гэтым здраднікам і сацыял-фашыстам няма месца сярод беларускіх працоўных гушчаў.

Працоўныя масы Зах. Беларусі гуртуюцца каля сваіх сялянска-работніцкіх паслоў, а здраднікаў ці то „сваіх" ці „чужых" пагоняць прэч!

— **В. Гірычы, Навагрудчына.** Наш абшарнік Старавіскі задумаў залажыць „Kółko Rolnicze" і вось распачаў ён акцыю. Пачаў пры помачы сваіх служак (солтыс) намаўляць сялян, каб запісваліся ў гэтае „Кулка".

Заданьне кулка было наступнае: каб агульнымі сіламі зложыўшыся купіць патрэбныя гаспадарчыя машыны.

Аднак, сяляне зразумелі, што, калі яны купяць машыны, то на сваіх „шнурочках" нічога пры помачы іх ня зробяць. Што гэтыя машыны патрэбныя абшарніку, бо ў яго вялізарныя абшары зямлі, дзе можна працаваць пры помачы машыны. І ўсе, як адзін, адказалі, што нам патрэбная зямля, а пасьля можна думаць і аб машынах. І ў гэтыя „Кулкі" вам ня ўдасца нас зацягнуць, як не ўдаецца Ярэмічу і Рагулі ўцягнуць у свой Інстытут або ў Сялянскі Саюз, як не ўдаецца Сталару ўцягнуць у свой „Зьвяз", бо ў усіх вас аднолькавая мэта — гэта адцягнуць нас ад барацьбы за лепшае заўтра.

Т—разак.

З Радавае Беларусі.

Хроніка беларускага друку.

1) Паступіла ў друк у Беларускім Дзяржаўным Выдавецтве вялікая навуковая праца на расейскай мове вядомага пісьменьніка Л. Клейнборта „Молодая Белорусь" — очерки белорусской литературы с 1905 — по 1928 г. Кніга мае быць багата ілюстраванай.

2) Вышла з друку на нямецкай мове „Беларуская Культура" — выданьне Беларускага таварыства культурнае сувязі з заграніцай.

3) Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва выдае ў перакладзе Янкі Купалы творы ўкраінскага пісьменьніка, П. Панча „Зямля" і А. Любчэнка — „Пастух", „Ціхі Хутар" і „№ 2002".

4) У Беларускім Дзяржаўным Выдавецтве вышлі на польскай мове апавяданьні. Я. Нёманскага „Маці" і Я. Коласа „На прасторах Жыцьця".

5) Міхайла Грамыка перапрацаваў і здаў да друку Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву сваю п'есу „Каля тэрасы".

Падрыхтаваны і зданы для друку ў Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва А. Звонакам новы зборнік вершаў „Буры ў граніцэ".

П. Шмкевіч і А. Казлоў напісалі і далі Бел. Дзярж. Выдавецтву для надрукаваньня падручнік „Грамадазнаўства ў Школе" на беларускай мове.

Беларускае Дзярж. Выдавецтва ў хуткім часе выдае асобным зборнікам усе поэмы беларускага паэты Міхася Чарота.

У Беларускім Дзярж. Выдавецтве рыхтуецца да друку „Краязнаўства на Беларусі" (нарысы) М. Касьпяровіча, разьмерам 10—12 друкаваных аркушоў.

Друкуецца новая беларуская дзіцячая літэратура: Якуб Колас „Кавалі", казка; М. Крыніцкі „Пра ваўчка", апавяданьне; Мур — „У бурную ноч", апавяданьне; Матвіенка „Аленка", апавяданьне.

Беларускі драматур У. Галубок здаў Бел. Дзярж. Выдав. для друку сваю п'есу „Ганка".

Экспорт малочных прадуктаў.

У верасьні с. г. Бел. Сялянскім Трэстам вывезена ў Нямеччыну 3 вагоны галяндэрскага сыру. Беларускі сыр карыстаецца ў нямецкім рынку пасьпехам.

У бліжэйшыя дні Белсельтрэст адпраўляе ў Бэрлін яшчэ партыю галяндэрск. сыру.

Рэдактар-Выдавец: В. Філіповіч.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.